№4 КРАСАВІК 2008

# Настаўнік.info

ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ ДЛЯ НАСТАЎНІКАЎ

## Грамадскія арганізацыі дапамагаюць настаўніку



Настаўнікі – народ вельмі заняты. Але і вельмі арганізаваны. Таму, у адрозненне ад вучняў, ім хапае часу і на самаадукацыю, і на іншыя карысныя справы. Пры жаданні, само-сабой.

А гэты артыкул прызначаны для калегаў, ахвотных зрабіць нешта добрае, сацыяльна-значнае. Для тых, хто шкадуе часу на вечную беларускую песню "Няма грошай, няма здароўя, начальства дастала…" І прысвечаны ён агляду адукацыйных грамадскіх арганізацыяў, якія б маглі дапамагчы нашаму настаўніку самарэалізавацца ды час ашчадзіць.

Крышачку пра грамадскія аб'яднанні. Тэрмін "грамадская арганізацыя" ці "грамадскае аб'яднанне" (па-англійску Non-Governmental Organization (NGO) у нашай краіне крыху дыскрэдытаваны дзяржаўнай прапагандай. Ну, па-першае, таму, што грамадскімі аб'яднаннямі пачалі называць БРСМ, піянераў, нават "Белую Русь". Па-другое, сапраўдныя грамадскія арганізацыі, якія незалежныя ад дзяржавы паводле азначэння, улада не кантралюе ў такой ступені, як бы ёй хацелася, таму і баіцца іх. З гэтай прычыны нават "Таварыства аматараў хамячкоў" можа стаць у вуснах дзяржаўных СМІ тэрарыстычнай арганізацыяй, "адмарозкамі" і дэструктыўнай апазіцыяй.

З вышэйзазначаных прычынаў паспрабуем вярнуць сапраўдны сэнс гэтаму тэрміну.

Грамадскія арганізацыі – гэта дабраахвотныя аб'яднанні людзей, заснаваныя на агульнасці інтарэсаў, ці для вырашэння якой-небудзь праблемы. Знікне праблема – знікне і грамадская арганізацыя, прызначаная яе вырашаць. Менавіта таму ў большасці краінаў прыняты заяўляльны, а не дазваляльны прынцып рэгістрацыі грамадскіх арганізацыяў у органах ўлады. Найстарэйшая ў Беларусі грамадская арганізацыя – "Таварыства беларускай школы", заснаваная больш за 80 год таму для вырашэння праблемаў беларускамоўнага навучання, не знікла дагэтуль. І, на жаль, у хуткай перспектыве не знікне. Нават калі яе ліквідуе Міністэрства юстыцыі, застануцца людзі: бацькі, настаўнікі, вучні, якія будуць гуртавацца, пакуль не вырашаць праблему.

Грамадскія арганізацыі яшчэ называюць "трэці сектар". Тут маецца падкрэсліць адрозненне ад першага – дзяржаўнага і другога – бізнэс-сектара грамадства. Адрозненне паміж сектарамі найперш тычыцца мэтаў: мэта дзяржаўнага сектара – забеспячэнне кіравання дзяржавай, падтрыманне парадку, бізнэсовы сектар мае за мэту атрыманне прыбытку. Таму сапраўдныя грамадскія арганізацыі не могуць мець ні палітычных, ні камерцыйных мэтаў. Яны могуць уплываць на прыняцце палітычных рашэнняў ці эканамічных законаў і праектаў праз грамадскую думку.

Ну і апрошняе – грамадскія арганізацыі складаюцца з добраахвотнікаў. Туды ідуць паводле пераканання, а не з-за выгодаў ці пад прымусам. Таму яны ў Вялікабрытаніі, напрыклад, называюцца валанцёрскімі. У дэмакратычных краінах дзяржава зацікаўлена ў развіцці грамадскіх арганізацыяў – яны маюць шмат добраахвотнікаў, гатовых працаваць дзеля ідэі, таму вырашаюць праблемы грамадства нашмат меншымі сродкамі. Напрыклад, вырашэнне сацыяльных праблемаў: рэабілітацыя алкаголікаў, наркаманаў, дагляд састарэлых людзей, дапамога беспрацоўным і г.д. у Вялікабрытаніі цалкам аддадзеныя грамадскім арганізацыям.

Цяпер зразумела, чаму ні БРСМ, ні ДТСААФ не з'яўляюцца грамадскімі арганізацыямі. БРСМ мае дзяржаўнае фінансаванне, яго мэта - не вырашаць праблемы моладзі, а кантраляваць яе. ДТСААФ прымусова залічвае, ўсіх наведвальнікаў аўташколаў у свае сябры. Інакш не атрымаеш правы на кіраванне аўтамабілем. Ужо нельга назваць грамадскімі арганізацыямі і прафсаюзы – яны настолькі кантралююцца дзяржавай, што забыліся пра свае мэты – абарону правоў працоўных. Але настаўнікам лепш ведаць, ці выступае прафсаюз работнікаў адукацыі супраць кантрактнай сістэмы, закрыцця сельскіх школаў ці незаконных звальненняў настаўнікаў, ці бароніць іх ад бессэнсоўнай школьнай бюракратыі. Грамадскія арганізацыі, створаныя дзяржавай, і называюць GONGO (Government Organized NGO), а арганізацыі, якія хаваюць свой бізнэс пад выглядам грамадскай дзейнасці - BONGO (Business Organized NGO). Гэтыя назвы маюць адмоўную афарбоўку.

Таму далей гаворка пойдзе пра сапраўдныя адукацыйныя грамадскія арганізацыі, якія Настаўнік.інфо рэкамендуе сваім калегам.

- **РГА "Таварыства беларускай школы" і РГА "Таварыства беларускай мовы"** – аб'ядноўваюць

**АСОБА Ў АДУКАЦЫІ: ЛЯВОН БАРШЧЭЎСКІ**
**>>> СТАР. 2**

**НОВЫЯ КОНКУРСЫ, ПРАГРАМЫ ДЛЯ НАСТАЎНІКАЎ**
**>>> СТАР. 3 - 4**

# Грамадскія арганізацыі дапамагаюць настаўніку

людзей, зацікаўленых ў пашырэнні роднамоўнага навучання. Маюць суполкі ва ўсіх абласцях і ў большасці раёнаў Беларусі.

- **ГГА "Цэнтар Супольнасьць"** з 2000 году вядзе праграму "Настаўнік – Школа – Грамадства", накіраваную на метадычную і грамадзянскую адукацыю педагогаў для дэмакратызацыі сістэмы адукацыі нашай краіны.
- **Аб'яднанне маладых навукоўцаў ВІТ** (Гродна) – праводзтць праграмы па правах дзіцяці, грамадазнаўству, юрыдычных асновах, краязнаўству.
- **ГА Цэнтр "Трэці сектар"** (Гродна) – вядзе найвыдатнейшую школу маладога журналіста. Прымаюць вучняў з 16 год. Вельмі раім куратарам школьных прэс-цэнтраў, газет, інтэрнэт-сайтаў.
- **ГА "Адукацыйны цэнтр ПОСТ"** – добра вядомы не толькі сваімі метадычнымі трэнінгамі, але і бюлетэнем "Куток настаўніка". Па выніках уласных праграмаў мае цэлы шэраг метадычных дапаможнікаў.
- **Сацыяльна-педагагічнае грамадскае аб'яднанне "Чазенія"** (Заслаўе) – праводзіць метадычныя семінары для педагогаў па стратэгіі актыўнага навучання, трэнігі для падлеткаў.
- **ГА "Фокус-група"** – асабліва раім сацыяльным педагогам, супрацоўнікам інтэртнатаў, тым, каму патрэбна літаратура па прафілактыцы ВІЧ, здароваму ладу жыцця, профарыентацыі.
- **ГА "Дыярыуш"** – рэгулярна праводзіць конкурсы для дзяцей на тэму "Блізкая гісторыя".

Зразумела, мы пералічылі не ўсе арганізацыі, з якімі варта супрацоўнічаць. Калі ў вас ёсць патрэба знайсці кантакт калегаў ці арганізацый, з якімі б вы хацелі супрацоўнічаць у нейкай тэме, калі ласка, пішыце нам на электронную скрыню nastaunik.info@gmail.com , мы абавязкова злучым вас з аднадумцамі.

*АленаЧмель.*

*Фота Веры Мацкевіч*

*АСОБА Ў АДУКАЦЫІ*

# ЛЯВОН БАРШЧЭЎСКІ: Філолаг я паводле прафесіі, палітык – паводле неабходнасці, а настаўнік – паводле паклікання"

*Лявон Баршчэўскі нарадзіўся ў Полацку 4 сакавіка 1958 года. Скончыў Мінскі пэдагагічны інстытут замежных моваў. Мае ступень кандыдата філалагічных навук. Працаваў выкладчыкам нямецкай і англійскай моваў у роднай школе №10 у Полацку, у Наваполацкім політэхнічным інстытуце. Выкладае ў Гуманітарным ліцэі імя Якуба Коласа. На 10 з'ездзе Партыі БНФ у снежні 2007 г. быў абраны старшынём Партыі. Займаецца шырокай перакладніцкай дзейнасцю са старажытнагрэчаскай, лацінскай, нямецкай, англійскай, французскай, польскай, іспанскай моваў. Пераклаў Эсхіла, Пэтрарку, Каўку, Брэхта, Ленаў, Бёля. Акурат да свайго 50-годдзя Лявон Пятровіч прэзентаваў укладзены ім унікальны 28-моўны беларуска-лацінска-еўрапейскі слоўнік.*

**Шлях да настаўніцтва і Беларушчыны**

"Прафесія настаўніка за савецкім часам была яшчэ менш прэстыжная, чым цяпер. Калі я хадзіў недзе ў шосты клас, мой старэйшы брат паступіў у БДУ і, прыязджаючы дадому, не раз расказваў розныя страхоцці пра долю настаўніка. Усё закончылася тым, што ён



*На фотаздымку Лявон Баршчэўскі разам з навучэнцамі Ліцэя*

сам больш за 30 гадоў прапрацаваў настаўнікам , а я таксама пайшоў падобным шляхам...

Што да Беларушчыны... Я меў бацьку-беларуса і маці-рускую – і з маленства ў мяне цвёрда сфармавалася перакананне, што беларусы і расійцы – гэта далёка не адно і тое самае. Калі лёс звёў мяне ў Наваполацку з колам аднадумцаў (Уладзімір Арлоў, Сяржук Сокалаў-Воюш, Вінцэсь Мудроў, Ірына Жарнасек і інш.), усё неяк само сабою "выстраілася"..."

**"Адукацыя – гэта праект на многія гады"**

"У чалавека ёсць дзве дарогі: або ён няспынна вучыцца – і тады ён развіваецца; або ён перастае вучыцца – і тады ён дэградуе, нават калі сам не хоча верыць у гэта. Адукацыя на нашых вачах змяняе сваю сутнасць. Спрадвеку настаўнік, выкладчык быў крыніцай ведаў для тых, хто такіх ведаў яшчэ не паспеў набыць... Цяпер няма праблем знайсці неабходную інфармацыю (калі гэтага, вядома, хацець). Настаўнік у такім выпадку ператвараецца ў філосафа, які інтэрпрэтуе тыя веды, якія ёсць, з аднаго боку, у яго, а з другога боку, у яго вучняў. І гэта вымагае ад сённяшняга настаўніка іншага ўзроўню здольнасці да рэфлексіі.

Адукацыя – гэта праект на многія гады. Калі ў ёй і бываюць нейкія перыяды ўпадку, то ў гістарычнай перспектыве яны нічога не значаць. Перабудову ў СССР у васьмідзесятыя гады рабілі "шасцідзесятнікі". Так і тут: нашае пакаленне 1990-х яшчэ вельмі выразна пакажа сябе, упэўнены ў тым.

Я быў адным з суаўтараў Закону аб адукацыі 1991 году – кіраваў адной з групаў. Дарэчы, другую ўзначальваў Аляксандар Казулін. Потым мы знайшлі нейкі кампрамісны варыянт пра пашырэнне сеткі ліцэяў і гімназій і пра пэўную селекцыю адораных дзяцей... Гэта ўсё працавала.

А цяпер нішчыцца. Напрыклад, увядзенне ў ВНУ так званага сярэдняга балу зводзіць фактычна на "нуль" усю тую рэформу.

Але ранейшае вернецца! Не вечна будзе тое, што робіцца цяпер з кан'юнктурнай палітыка-ідэалагічнай матывацыі... У рэшце рэшт, будуць ва ўладзе людзі, якія зразумеюць, што гэта тупіковы шлях".

**Пра лёс Канцэпцыі нацыянальнай школы і пра ідэю "адкрываць свет праз Беларусь"**

"Свет мяняецца вельмі імкліва. Цяпер, у век інтэрнэту і выклікаў эпохі глабалізацыі, хутчэй, больш рэальным робіцца падыход "адкрываць Беларусь праз свет". Усё, што цікавае, неардынарнае адбываецца ў свеце, павінна – пасля неабходнай трансфармацыі – быць інтэрпрэтавана па-беларуску."

**Пра самадастатковасць беларускай культуры і стан перакладной літаратуры**

"Беларуская культура, безумоўна, самадастатковая – як і любая іншая культура тытульных нацыяў еўрапейскага абшару. І справа перакладу падтрымліваецца: ёсць досыць шмат замежных цэнтраў і фундацыяў. Але без удзелу ў ёй беларускай дзяржавы пакуль што абыходзіцца няпроста. Тое, што можна выдаць, мала хто хоча перакладаць, а тое, што з імпэтам перакладалася, не заўсёды лёгка выдаць (ёсць, паміж іншага, вельмі сур'ёзнае пытанне набыцця аўтарскіх правоў). Да таго ж, перакладнікаў не хапае, бо гэта фізічна цяжкая праца,

якая вымагае, акрамя наяўнасці таленту, яшчэ і цярплівасці ды мэтанакіраванасці. Гэткіх людзей наогул не так і шмат”.

**Пра Ліцэй імя Якуба Коласа**

“Ліцэй зноў-такі будаваўся вакол групы вельмі адметных, неардынарных асобаў – і ўжо таму мусіў мець посьпех. Калі супольнасць педагогаў мае ў галаве перадусім агульнае дабро, а свае прыватныя праблемы ставіць на другое месца, тады і можа ўзнікнуць нешта такое, як наш Ліцэй. У той самы час, перспэктыва вучыць “адборных” дзяцей па-беларуску, глядзець на ўвесь свет беларускімі вачыма стварала і стварае мажлівасць настаўніку кожныя заняткі, кожную пазакласную ліцэйскую справу адчуваць як нешта непаўторнае. Гэта значыць, што эксперымент вядзецца няспынна, а вынік гэтага эксперыменту – дасягненні і лёсы тых, хто вучыўся й вучыцца ў Ліцэі.

**Формула для настаўніка: “Любі не толькі самаго сябе”**

“Беларускае настаўніцтва вярнулі ў стойла. Вярнулі ў стан даперабудовачных часоў (да 1985 году), калі настаўнік выконваў, як у расійскай імпэрыі, функцыю правадніка палітыкі, умацавання ўлады. Дзеля гэтага настаўнікаў актыўна выкарыстоўваюць у выбарчых камісіях для легітымізацыі існуючай улады.

Творчы пачатак, які пачаў у настаўніцтва праяўляцца ў пачатку 90-х гадоў, зноў адышоў назад. Настаўнік не мусіць быць эгаістам, павінны заўсёды думаць пра іншых, а не толькі пра сябе, умець аддаваць, а не браць. Таму і стаўленне ў грамадстве да настаўніка вярнулася на ўзровень 1985 году. Цяпер настаўнік – гэта той, хто толькі транслюе праз дзяцей, у тым ліку і бацькам, волю вышэйшай улады”.

**Пра сваю ролю бацькі і настаўніка ў выхаванні ўласных дзяцей**

“Хутчэй, вядома, для сваіх дачок я настаўнік, які, аднак, не вучыць жыццю, а вучыць зноў-такі гэтае жыццё асэнсоўваць. Маім дзецям, здаецца, ніколі не былі ўласцівыя такія якасці, як нявыхаванасць або непамерныя амбіцыі... І за гэта я іх не толькі люблю, а і паважаю”.

**Пажаданне беларускім настаўнікам**

“Не прымайце на веру нічога, асэнсоўвайце свет штодзённа, штогадзінна і штохвілінна!”

*Матэрыял падрыхтавала Ганна Краснова*

*Фота Крысціны Сіўчыкавай*

***РЫХТУЕМСЯ ДА ЛЕТА***

# АДПАЧЫНАК З КАРЫСЦЮ ДЛЯ ГРАМАДСТВА

**Прапануем Конкурс інфармацыйна – адукацыйных летніх праектаў**



Конкурс накіраваны на падтрымку адукацыйнай і інфармацыйнай дзейнасці педагогаў і адукатараў у летні перыяд.

Праекты могуць быць выкананы ў розных формах, такіх, як праца у летніках, сустрэчы, трэнінгі для навучэнцаў, калегаў, мясцовых жыхароў, падрыхтоўка і выпуск актуальных інфармацыйных матэрыялаў для пэўных сацыяльных груп і г.д. Вітаюцца праекты, досвед якіх можа быць распаўсюджаны на рэгіянальным і нацыянальным узроўні, якія накіраваныя на грамадзянскую адукацыю, развіццё крытычнага мыслення дзяцей, моладзі, педагогаў, бацькоў, мясцовага насельніцтва, якія пашыраюць дэмакратычныя каштоўнасці незалежнай беларускай дзяржавы.

Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца настаўнікі, выкладчыкі вышэйшых і сярэдніх спецыяльных установаў, выхавальнікі, бацькі, асобы і грамадскія арганізацыі, якія працуюць ў сферы фармальнай і нефармальнай адукацыі.

Умовы конкурса:

– праект можа быць выкананы ад даты абвяшчэння вынікаў конкурса да верасня 2008 года ўключна;

– справаздача па праекце павінна быць здадзена не пазней за 30 верасня 2008 года;

– максімальны бюджэт праекта 500 $;

– перавага будзе аддавацца малабюджэтным праектам;

– для ўдзелу ў конкурсе патрэбна запоўніць анкету-заяўку (глядзіце ніжэй) і даслаць яе на электронны адрас **kupalinka2008@gmail.com** да панядзелка 5 мая 2008 года*.

– як правіла, не падтрымліваюцца адміністрацыйныя выдаткі, закупка тэхнікі.

* Пра вынікі конкурса будзе паведамлена да канца мая.

*паводле рассылкі VB*

**Анкета-заяўка**

I. Інфармацыя аб каардынатары праекта:

Назва праекта:

Назва арганізацыі, ініцыятывы (калі ёсць):

Прозвішча, імя, імя па бацьку кіраўніка праекта:

Кантакты (поўны адрас з індэксам, гарадскі тэлефон з кодам горада ці мабільны тэлефон, e-mail):

Тэрмін выканання праекта (не пазней за 30 верасня 2008 года павінна быць здадзена справаздача па праекце):

II. Рэзюмэ праекта(1 абзац)

Кароткае апісанне праекта. Рэзюмэ павінна быць зразумелым, сціслым, канкрэтным, выразным і адказаць на пытанні:

- для чаго і для каго патрэбны гэты праект (мэтавая група і мэта праекта)?
- хто і якім чынам будзе выконваць праект?
- што атрымаецца ў выніку?
- рэзананс праекту ў грамадскасці

III. Інфармацыя пра арганізацыю (асобу) (1-2 абзацы)

Утрымлівае звесткі пра арганізацыю ці асобу, ад якой падаецца праект.

IV. Мэтавая група (1 сказ)

На каго і на якую мясцовасць разлічана запланаваная дзейнасць.

V. Апісанне дзейнасці ў межах праекту (не больш за старонку)

Што будзе зроблена ў межах праекта? Хто будзе выконваць дзеянні? Ці плануецца прыцягнуць валанцёраў?

VI. Ацэнка праекта (чаканыя вынікі)

Якія вы чакаеце вынікі і якім бачыце магчымы працяг праекта.

(пункты IV, V, VI разам павінны займаць 1,5-2 старонкі).

VII. Бюджэт.

Падрабязнае апісанне кожнага артыкула выдаткаў (не больш за 500 у.а. ці 1 100 000 BRB)

Дата:

Каму і куды паведаміць пра вынікі конкурсу:

# Навіны адукацыі, конкурсы, праграмы, праекты

– Мікалай Корбут запатрабаваў больш актыўна шукаць грошы для бюджэту. Па словах міністра, у 2007 годзе «міма кас» прайшло каля 40 млн. даляраў, якія не атрымалі з-за рэпетытараў-нелегалаў.

– Настаўнікам захавалі водпускі 56 працоўных дзён. А выхавальнікам дзіцячых садоў скарацілі на траціну.

– З наступнага навучальнага года субота абʼяўляецца выходным днём для ўсіх школьнікаў. Не паспелі парадавацца старшакласнікі, што ў суботу зранку на свежыя мазгі можна хадзіць да рэпетытараў, каб кампесаваць недахоп школьных ведаў, як прыйшла новая навіна:

– У новым навучальным годзе у школах можа зʼявіцца дадатковы ўрок — «Гадзіна футбола». Па суботах вучні змогуць ганяць мяч на школьных пляцоўках і ў спартыўных залях.

– Плата за навучанне ва Ўкраіне ніжэй, чым у шматлікіх беларускіх ВНУ. Вучыцца ва Ўкраіне зручна - блізка, віза не патрэбна, затое з Еўропай у Украіны зараз сувязяў відавочна больш. Моўны барʼер пакуль не праблема. Тут беларусаў выручае родная мова, з ёй украінскую разумець значна лягчэй.

– У бліжэйшай будучыні ў кожнай школе Мінска будзе ўведзены "электронны кашалёк" – пластыкавая картка для разліку за харчаванне.

– З гэтага года ў Беларусі распачнецца падрыхтоўка кадраў для атамнай і аднаўляльнай энергетыкі.

– У 2008/2009 навучальным годзе Міністэрства адукацыі завяршае паэтапнае ўвядзенне адзення дзелавога стылю ў школе. У наступным навучальным годзе "дэ-юрэ" дзелавы стыль школьнага адзення распаўсюдзіцца і на вучняў 10—12-х класаў беларускіх школ.

– Праца над Кодэксам аб адукацыі прыпыненая. Чыноўнікі не змаглі вызначыць, якой усё ж мусіць быць сярэдняя школа ў Беларусі — 12-ці ці 11-гадовай.

– 24 сакавіка падпісаны ўказ аб стварэнні дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзенні ўступных выпрабаванняў у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных вучэбных установах у 2008 годзе.

– Упершыню ў Беларусі ў навукова-метадычным часопісе для настаўнікаў выйшаў электронны дадатак. Выдавецтва "Пачатковая школа" першым сярод усіх навукова-метадычных часопісаў Міністэрства адукацыі выпусціла мульты-медыйны дыск да сакавіцкага нумару часопіса.

– Беларускі студэнт - самы абаронены студэнт у свеце. Аб гэтым заявіла начальнік галоўнага ўпраўлення сацыяльна-эканамічнага развіцця Міністэрства адукацыі Лідзія Субоцкая на пасяджэнні пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях 2 красавіка ў Мінску.

– На сакавіцкай канферэнцыі ў Вене - «Беларусь у Еўропе: Эканамічнае супрацоўніцтва і палітычны дыялог» акрамя эканомікі шмат абмяркоўвалі масавае выключэнне беларускіх студэнтаў па палітычных матывах. Рэктар БДЭУ Уладзімір Шымаў быў вымушаны пачаць свой выступ на тэму эканомікі з апраўданняў. Падчас выступу Шымава прадстаўнікі аўстрыйскага студэнцкага звязу раскрылі вялікі банер з надпісам «STOP political expulsions of students».

– У Літве пачынаецца бестэрміновы страйк настаўнікаў. У сярэднім яны атрымліваюць за працу пяцьсот долараў, але не задаволеныя гэтым заробкам.

– Беларускія настаўнікі выказалі адкрытую нязгоду з пазіцыяй галоўнага ідэолага Рубінава. 4 красавіка 2008 г. на сайце міністэрства адукацыі зʼявіўся ліст пад назвай «Пачуйце настаўніка», дзе настаўнікі бароняць профільнае навучанне, 12-гадовую школу і просяць кіраўніцтва краіны весці публічнае абмеркаванне праблем адукацыі на прафесійным, а не на эмацыйным узроўні. Ліст падпісалі педагогі -пераможцы конкурса "Настаўнік года" 2001-2006 гг.

- У сеціве зʼявіўся сайт клуба "Беларускае кола", створанага навагрудскімі настаўнікамі і вучнямі. Адрас сайта – http://belkola-org.na.by/

- У Беларусі створаць рэйтынг школ і ўніверсітэтаў. Асноўным крытэрам для школ можа быць працэнт уладкаванасці ў жыцці яе выпускнікоў — дастатак, сямейны дабрабыт, карʼерны рост.

**Інфармацыя пра конкурсы, праграмы, праекты**

– **Праграма падтрымкі развіцця грамадзянскай супольнасцію**

Чэшская няўрадавая арганізацыя «Чалавек у нядолі" распачынае прыняццё заяваў на мікраграанты (сярэдняя сума да 2000 долараў) па праектах для развіцця і падтрымкі грамадзянскай супольнасці і праваоў чалавека ў рэгіёнах Беларусі. Мэтамі праграмы зʼяўляюцца: ак-тывізацыя грамадскай дзейнасці ў рэгіёнах, далучэнне новых людзей да грамадскай дзейнасці, пашырэнне праваабарончых каштоўнасцяў. Удзельнічаць у конкурсе могуць няўрадавыя арганізацыі, ініцыятыўныя групы і нефармальныя абʼяднанні.

Заявы прымаюцца па-беларуску ў адным з фарматаў: .doc, .rtf, .pdf .

Апошні тэрмін падачы заяваў – 17 красавіка 2008 г. на адрас mikraprajekty@email.cz паводле дадатка "Апісанне праекта", які прыведзены: http://nastaunik.info/news/564

**Праграма беларуска-нямецкай супрацы**

Праекты, скіраваныя на развіццё супрацоўніцтва паміж беларускімі і нямецкімі арганізацыямі, могуць быць падтрыманыя ў межах "Праграмы кантактаў Беларусь".

Мэтай Праграмы зʼяўляецца супрацьдзеянне ізаляцыі беларускага грамадства ў Еўропе праз стымуляванне супрацоўніцтва і абмен досведам паміж арганізацыямі з Беларусі і Германіі, прадстаўленне разнастайнай карціны Беларусі нямецкаму грамадству ў межах эфектыўных і грамадска-значных мерапрыемстваў.

Падрабязная інфармацыя знаходзіцца на вэб-старонцы www.dgo-online.org (толькі на нямецкай мове). Там жа інструкцыі па складанні заяўкі.

**Праграма супрацоўніцтва паміж беларускімі, польскімі і нямецкімі арганізацыямі**

Фонд ім. Роберта Боша (ФРГ), ім. Стэфана Баторыя (Польшча) і PAUCI (Украіна) абвясцілі конкурс на атрыманне грантаў у рамках праграмы "Kontaktprogramm" з мэтай развіцця і падтрымкі доўгатэрміновага супрацоўніцтва паміж грамадзянскімі ініцыятывамі Польшчы, Германіі, Украіны, Беларусі і Калінінградскай вобласці.

Прымаць удзел у конкурсе могуць арганізацыі і ініцыятывы са статусам НДА, а таксама іншыя публічныя арганізацыі або ўстановы, такія як школы, сацыяльныя і культурныя цэнтры, бібліятэкі, музеі.

Праект павінны насіць трохбаковы характар, улічваць інтарэсы ўсіх трох партнёраў, спрыяць вырашэнню рэальных праблем у галіне грамадзянскай і палітычнай адукацыі, адукацыі ў экалогіі, еўрапейскай інтэграцыі, а таксама спрыяць захаванню агульнай гістарычнай спадчыны трох краін.

Заяўкі падаюцца на нямецкай ці англійскай мовах.

Парадак падачы заявак:

1. Падача праектнай ідэі – да 31.05 2008.
2. Конкурсны адбор і запрашэнне адабраных прэтэндэнтаў на сумесны семінар па напісанні праектнай заяўкі – да 01.07.2008.
3. Семінар па напісанніі праектнай заяўкі – 22–24.09.2008.
4. Напісанне праектнай заяўкі і падача праекта– 14.11. 2008.
5. Конкурсны адбор – снежань 2008 г.
6. Пачатак рэалізацыі праектаў – 01.02.2009.
7. Канец рэалізацыі праектаў – 31.12.2009.

Больш інфармацыі аб праграме можна атрымаць на старонках www.bosch-stiftung.de/gesellschaftliche_initiative, www.batory.org.pl/pis, www.pauci.org, а таксама па электроннай пошце: nopassaran_08@mail.ru

Настаўнік.інфо.
Інфармацыйна-метадычны бюлетэнь для настаўнікаў
Выдаецца ініцыятыўнай групай стваральнікаў сайта *Nastaunik.info*
Адрас для допісаў: *nastaunik.info@gmail.com*
Наклад *200* асобнікаў